(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ

ІНСТЫТУТ МОВАЗНАЎСТВА ІМЯ ЯКУБА КОЛАСА

УДК 808.26 – 558

**АНДРЭЕВА**
**Алеся Уладзіміраўна**

# КАТЭГОРЫЯ ТРЫВАННЯ ДЗЕЯСЛОВА Ў БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ (ГРАМАТЫКА-СЛОВАЎТВАРАЛЬНЫ АСПЕКТ)

10.02.01 – беларуская мова

Аўтарэферат
дысертацыі на атрыманне вучонай ступені
кандыдата філалагічных навук

Мінск – 2005

Работа выканана ў аддзеле беларуска-рускіх моўных сувязей Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі

Навуковы кіраўнік: доктар філалагічных навук, прафесар
**А.А. Лукашанец,**
Інстытут мовазнаўства
імя Якуба Коласа НАН Беларусі

Афіцыйныя апаненты: доктар філалагічных навук
**В.П. Русак,**
Інстытут мовазнаўства
імя Якуба Коласа НАН Беларусі,
аддзел сучаснай беларускай мовы

кандыдат філалагічных навук, дацэнт
**З.І. Бадзевіч,**
Беларускі дзяржаўны універсітэт,
кафедра сучаснай беларускай мовы

Апаніруючая арганізацыя – УА "Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка"

Абарона адбудзецца 24 чэрвеня 2005 г. у 14.00 гадзін на пасяджэнні Савета па абароне дысертацый Д 01.43.01 пры Інстытуце мовазнаўства імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (220072, г. Мінск, вул. Сурганава, 1, корп. 2; тэл. 284-18-85).

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Аўтарэферат разасланы 24 мая 2005 г.

Вучоны сакратар Савета
па абароне дысертацый
кандыдат філалагічных навук Н.В. Паляшчук

# АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Актуальнасць тэмы дысертацыі.** Аспекталогія – адзін з параўнальна маладых, але надзвычай важных і прыярытэтных напрамкаў сучаснай лінгвістычнай навукі. Катэгорыя трывання і сумежныя з ёй семантычныя з'явы на працягу ўжо некалькіх дзесяцігоддзяў знаходзяцца пад пастаяннай і пільнай увагай даследчыкаў. Гэта абумоўлена складанасцю і своеасаблівасцю катэгорыі трывання (што выклікае мноства самых розных пунктаў гледжання на яе прыроду і сутнасць), цэнтральным становішчам у граматычнай сістэме дзеяслова, сувязямі з лексікай і словаўтварэннем. Аднак, нягледзячы на працяглую традыцыю і значныя дасягненні ў даследаванні данай катэгорыі, наяўнасць багатай літаратуры па разнастайных праблемах трывання, некаторыя пытанні да апошняга часу не маюць канчатковага вырашэння і патрабуюць далейшага вывучэння і глыбокага асэнсавання. Практычна не распрацаваны пытанні, звязаныя са словаўтваральнай спецыфікай катэгорыі трывання. У прыватнасці, аспекты ўзаемасувязі данай катэгорыі і дэрывацыйных працэсаў (асаблівасці ўтварэння дзеясловаў таго ці іншага трывання, удзел дзеяслоўных словаўтваральных афіксаў у выражэнні трывальнага значэння і інш.) не былі аб'ектам спецыяльнага вывучэння.

Такое даследаванне немагчыма без папярэдняга вырашэння аднаго з ключавых і актуальных для мовазнаўства пытанняў – пытання аб словазменным або класіфікуючым статусе катэгорыі трывання, якое цесна ўзаемадзейнічае з важнай як у тэарэтычным, так і ў практычным плане праблемай вызначэння межаў словазмянення і словаўтварэння. З прычыны таго, што гэта пытанне ў беларускай лінгвістыцы наогул не разглядалася, яно набывае асаблівую актуальнасць.

**Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі, тэмамі.** Дысертацыя выканана ў аддзеле беларуска-рускіх моўных сувязей Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі ў межах Дзяржаўнай праграмы фундаментальных даследаванняў "Даследаванне беларускай мовы, яе гісторыі, сучаснага стану, сувязей з іншымі славянскімі мовамі, распрацоўка гісторыі і тэорыі беларускай літаратуры ў кантэксце сусветнага літаратурнага працэсу (Беларуская мова і літаратура) 2003-2005 гг.".

**Мэта і задачы даследавання.** Асноўнай мэтай дысертацыі з'яўляецца граматыка-словаўтваральная характарыстыка катэгорыі трывання дзеяслова ў беларускай мове.

Для дасягнення данай мэты ставіліся і вырашаліся наступныя задачы:

- вызначыць статус (словазменны або класіфікуючы) катэгорыі трывання дзеяслова ў беларускай мове;
- выявіць корпус вытворных дзеясловаў незакончанага трывання, дзеясловаў закончанага трывання і двухтрывальных дзеясловаў;
- устанавіць усе словаўтваральныя спосабы і сродкі ўтварэння дзеясловаў незакончанага і закончанага трывання і двухтрывальных дзеясловаў; вызначыць спосабы, найбольш характэрныя для ўтварэння дзеясловаў таго ці іншага трывальнага значэння; выявіць словаўтваральныя тыпы, у межах якіх адбываецца ўтварэнне дзеясловаў з пэўным трываннем; ахарактарызаваць словаўтваральныя тыпы паводле прадуктыўнасці;

- даследаваць спецыфіку суадноснасці лексічнага і трывальнага значэнняў дзеяслоўных словаўтваральных афіксаў.

**Аб'ект і прадмет даследавання.** Аб'ектам даследавання з'яўляюцца вытворныя дзеясловы незакончанага трывання, дзеясловы закончанага трывання і двухтрывальныя дзеясловы. Прадмет даследавання – аспекты ўзаемасувязі катэгорыі трывання і дэрывацыйных працэсаў (асаблівасці ўтварэння дзеясловаў таго ці іншага трывання і ўдзел дзеяслоўных словаўтваральных афіксаў у выражэнні трывальнага значэння).

**Матэрыял даследавання.** Матэрыялам даследавання паслужылі дзеяслоўныя лексемы, атрыманыя шляхам суцэльнай выбаркі з "Тлумачальнага слоўніка беларускай мовы" ў 5 тамах (6 кнігах) (Мн., 1977-1984), "Тлумачальнага слоўніка беларускай літаратурнай мовы" (Мн., 2002) і "Русско-белорусского словаря" ў 3 тамах (Мн., 2002). Агульная колькасць – больш за 20000 дзеясловаў.

**Гіпотэза**. Катэгорыя трывання дзеяслова ў сучаснай беларускай мове ўяўляе сабой некарэлятыўную катэгорыю класіфікуючага тыпу, якая паслядоўна рэпрэзентуецца формамі самастойных лексем.

**Метадалогія і метады даследавання.** Метадалагічнай асновай даследавання паслужыла палажэнне аб узаемасувязі і ўзаемазалежнасці адзінак і катэгорый лексічнага, марфалагічнага і словаўтваральнага ўзроўняў моўнай сістэмы. Мэта і задачы даследавання прадвызначылі апісальны метад, які з'яўляецца асноўным у данай рабоце. У дысертацыі выкарыстоўваюцца прыёмы словаўтваральнага аналізу і элементы колькаснага падліку.

**Навуковая навізна і тэарэтычная значнасць атрыманых вынікаў.** Навуковая навізна дысертацыі заключаецца ў тым, што ўпершыню ў беларускім мовазнаўстве прадметам самастойнага даследавання сталі аспекты ўзаемасувязі катэгорыі трывання і дэрывацыйных працэсаў (словаўтварэнне дзеясловаў таго ці іншага трывання, удзел дзеяслоўных словаўтваральных афіксаў у выражэнні трывальнага значэння). Абгрунтоўваецца класіфікуючы характар катэгорыі трывання дзеяслова ў беларускай мове. На аснове багатага фактычнага матэрыялу з неабходнай паўнатой апісваецца словаўтварэнне дзеясловаў пэўнай трывальнай характарыстыкі: дзеясловаў незакончанага трывання, дзеясловаў закончанага трывання і двухтрывальных дзеясловаў, удакладняюцца словаўтваральныя тыпы дзеясловаў, якія традыцыйна вылучаюцца ў беларускай дэрываталогіі, а таксама іх характарыстыка паводле прадуктыўнасці. Дзеяслоўныя словаўтваральныя афіксы разглядаюцца з пункту гледжання іх здольнасці выражаць лексічнае і трывальнае значэнні.

**Практычная значнасць атрыманых вынікаў.** Вынікі дысертацыйнага даследавання маюць значэнне для далейшай распрацоўкі пытанняў аспекталогіі і дзеяслоўнага словаўтварэння. Матэрыялы даследавання могуць прымяняцца ў выкладанні беларускай мовы пры вывучэнні раздзелаў "Марфалогія" і "Словаўтварэнне" ў вышэйшых навучальных установах на філалагічных факультэтах, а таксама пры падрыхтоўцы падручнікаў, вучэбных дапаможнікаў і лексікаграфічных даведнікаў.

**Асноўныя палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону:**

1. У сучаснай беларускай мове катэгорыя трывання дзеяслова з'яўляецца паслядоўна некарэлятыўнай катэгорыяй класіфікуючага тыпу. Члены трывальных карэляцый (як прэфіксальных, так і суфіксальных) маюць характэрныя для самастойных слоў прыметы: кожны з членаў трывальнай пары валодае, як правіла, сваёй сістэмай лексічных значэнняў; мае сваю зыходную форму (інфінітыў) і сістэму словазмянення; выступае ў якасці словаўтваральнай базы для пэўных груп лексем.

2. Для дзеясловаў незакончанага трывання, дзеясловаў закончанага трывання і двухтрывальных дзеясловаў уласціва свая сістэма словаўтваральных спосабаў і сродкаў. Адзін са спосабаў выступае асноўным, галоўным, астатнія выконваюць параўнальна меншую ролю.

3. У сувязі з класіфікуючым характарам катэгорыі трывання дзеяслова ў беларускай мове адсутнічаюць спецыяльныя словазменныя афіксы для выражэння трывання. У якасці сродку выражэння трывальнага значэння служаць словаўтваральныя па сваёй сутнасці афіксы. Гэта з'яўляецца адным з найважнейшых праяўленняў узаемасувязі марфалагічнага і словаўтваральнага ўзроўняў мовы.

4. Сярод дзеяслоўных словаўтваральных афіксаў асобную групу складаюць афіксы з чыста граматычным значэннем, якія выяўляюць істотныя рысы падабенства са словазменнымі афіксамі.

5. Суфіксы імперфектывацыі ў значнай ступені набліжаны да формаўтваральных сродкаў. Аб гэтым сведчаць наступныя факты: суфіксы імперфектывацыі спецыялізуюцца толькі для выражэння трывальнага значэння; выступаюць уніфікаванымі і стандартнымі сродкамі выражэння трывання; фарміруюць пераважна "чыстыя" трывальныя пары; з'яўляюцца адносна рэгулярнымі сродкамі ўтварэння трывальных карэляцый.

**Асабісты ўклад суіскальніка.** Дысертацыя з'яўляецца самастойным даследаваннем, асноўныя палажэнні і вынікі якога грунтуюцца на сабраным і сістэматызаваным аўтарам фактычным матэрыяле.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі.** Дысертацыя абмяркоўвалася на пасяджэнні аддзела беларуска-рускіх моўных сувязей Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі. Асноўныя палажэнні і вынікі даследавання прайшлі апрабацыю на наступных навуковых канферэнцыях: III Міжнародная навуковая канферэнцыя, прысвечаная 120-годдзю з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа (Мінск, 27-28 верасня 2002 г.); VI канферэнцыя Камісіі па славянскаму словаўтварэнню пры Міжнародным камітэце славістаў "Праблемы тэорыі і гісторыі славянскага словаўтварэння" (Мінск, 3-5 сакавіка 2003 г.); VIII Міжнародная канферэнцыя "Словаўтварэнне і намінатыўная дэрывацыя" (Гродна, 15-16 красавіка 2003 г.); навуковая канферэнцыя, прысвечаная 75-годдзю з дня заснавання Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі (Мінск, 2 лістапада 2004 г.).

**Апублікаванасць вынікаў.** Па тэме дысертацыі апублікаваны тры навуковыя артыкулы, матэрыялы двух дакладаў навуковых канферэнцый і тэзісы аднаго даклада (агульны аб'ём – 32 старонкі).

**Структура і аб'ём дысертацыі.** Дысертацыя складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, трох глаў, заключэння, спіса выкарыстанай літаратуры (194

адзінкі). Поўны аб'ём дысертацыі займае 185 старонак, у тым ліку асноўны тэкст – 105 старонак, табліцы (121) і схема – 68 старонак, спіс літаратуры – 12 старонак.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ РАБОТЫ

**Ва ўводзінах і агульнай характарыстыцы работы** абгрунтоўваецца выбар тэмы дысертацыі і яе актуальнасць, акрэсліваюцца мэта і задачы даследавання, вызначаюцца аб'ект і прадмет даследавання, фармулюецца гіпотэза, указваюцца метады даследавання, раскрываюцца навуковая навізна, практычная значнасць даследавання, асноўныя палажэнні, якія выносяцца на абарону, падаюцца звесткі пра апрабацыю вынікаў даследавання, яго структуру і аб'ём.

У **першай главе "Катэгорыя трывання дзеяслова: спрэчныя пытанні класіфікацыі"** разглядаюцца важныя і актуальныя пытанні тэорыі трывання, якія ў сучаснай аспекталогіі з'яўляюцца дыскусійнымі і не маюць адназначнага вырашэння. Даная глава складаецца з двух раздзелаў.

*Першы раздзел* прысвечаны пытанню аб характары катэгорыі трывання дзеяслова (словазменным або класіфікуючым). Адзначаецца, што, нягледзячы на больш чым стогадовую гісторыю яго вывучэння, да апошняга часу сярод даследчыкаў няма адзінага меркавання наконт статуса трывання. У мовазнаўстве склаліся тры канцэпцыі прыроды трывальнай пары.

Прадстаўнікі першай канцэпцыі (В.У. Вінаградаў, І.П. Мучнік, А.М. Ціханаў, А.А. Земская, А.А. Караванаў і інш.) прызнаюць члены трывальнай пары (як суфіксальнай, так і прэфіксальнай) граматычнымі формамі слова на падставе семантычнага крытэрыю. Тоеснасць лексічных значэнняў членаў трывальных карэляцый лічыцца паказчыкам таго, што яны з'яўляюцца формамі аднаго дзеяслова. Катэгорыя трывання адпаведна кваліфікуецца як катэгорыя словазменнага тыпу. Даная канцэпцыя ў сучаснай навуцы ўжо не знаходзіць шматлікіх прыхільнікаў і сустракаецца параўнальна рэдка.

Другая канцэпцыя прыроды трывальнай пары, якая атрымала шырокае распаўсюджанне, адрозніваецца дыферэнцыраваным падыходам да трывальных карэляцый. Яе прыхільнікі (Ю.С. Маслаў, А.У. Бандарка, А.М. Ломаў, М.А. Шалякін, Т.М. Малошная і інш.) разглядаюць члены суфіксальных пар як граматычныя формы аднаго і таго ж слова, а члены прэфіксальных пар – як розныя дзеяслоўныя лексемы. Падставай для такога разумення служаць у асноўным структурна-граматычны крытэрый – рэгулярнасць і паслядоўнасць утварэння трывальных карэляцый шляхам імперфектывацыі. Меркаванні вучоных разыходзяцца наконт пытання, ці з'яўляюцца пары тыпу *пісаць – напісаць* чыста трывальнымі. Ю.С. Маслаў і некаторыя іншыя, напрыклад, Т.М. Малошная наогул адмаўляюць наяўнасць такіх карэляцый, аднак большасць даследчыкаў (А.У. Бандарка, А.М. Ломаў, М.А. Шалякін і многія іншыя) дапускаюць магчымасць іх існавання. У адпаведнасці з гэтым аспектолагі робяць розныя вывады аб характары катэгорыі трывання. У першым выпадку яна прызнаецца словазменнай катэгорыяй, у другім – катэгорыяй змешанага тыпу: часткова словазменнай (у межах імперфектывацыі) і часткова класіфікуючай (у межах перфектывацыі).

У апошнія дзесяцігоддзі набывае прызнанне канцэпцыя прыроды трывальнай пары, згодна з якой члены трывальных карэляцый разглядаюцца як самастойныя словы. Катэгорыя трывання пры гэтым трактуецца як катэгорыя класіфікуючага тыпу (П.С. Кузняцоў, Н.А. Янка-Трыніцкая, Н.С. Авілава, І.Р. Міласлаўскі, А.В. Пятрухіна, У.А. Плунгян і інш.). Вучоныя адзначаюць недастатковасць крытэрыяў, пакладзеных у аснову дзвюх першых канцэпцый прыроды трывальнай пары. Яны ўказваюць, што паміж членамі не толькі прэфіксальных, але і нават суфіксальных пар, якія па-ранейшаму прызнаюцца многімі вучонымі граматычнымі формамі дзеяслова, няма абсалютнай семантычнай тоеснасці, а значыць, не дапушчальна лічыць трывальныя пары граматычнымі формамі слова. У выніку даследавання семантычных структур членаў трывальных карэляцый даследчыкі выяўляюць, што ў мнагазначных дзеясловаў даволі часта назіраюцца разыходжанні ў іх лексічных значэннях. Акрамя таго, семантычная тоеснасць членаў суфіксальных пар можа быць няпоўнай яшчэ і таму, што суфіксы імперфектывацыі могуць надаваць дзеяслову незакончанага трывання адценне паўтаральнасці дзеяння (*усклікнуць – ускліквань*).

Рэгулярнасць працэсу імперфектывацыі не з'яўляецца дастатковай структурна-граматычнай падставай для таго, каб прызнаваць трывальныя пары формамі аднаго дзеяслова. Утварэнне суфіксальных карэляцый не вызначаецца такой рэгулярнасцю, якая ўласціва для граматычных форм слова. Далёка не ў кожнага дзеяслова закончанага трывання абавязкова, як, напрыклад, форма часу і асобы, утвараецца суфіксальны карэлят. У мове адзначаюцца шматлікія выпадкі няпарнасці дзеясловаў закончанага трывання.

П.С. Кузняцоў, Н.С. Авілава і некаторыя іншыя прадстаўнікі гэтай канцэпцыі важнай структурна-граматычнай падставай для размежавання форм словазмянення і словаўтварэння лічаць аднесенасць членаў трывальных карэляцый да розных тыпаў спражэння, розных словазменных класаў, а таксама наяўнасць уласнай сістэмы словазмянення. Вучоныя выяўляюць супярэчнасць, якая ўзнікае пры прызнанні словазменнай трактоўкі катэгорыі трывання. Калі лічыць, што члены трывальных карэляцый як граматычныя формы толькі разам утвараюць поўную парадыгму дзеяслоўнага слова, то тады вельмі незвычайным для адной лексічнай адзінкі аказваецца наяўнасць не адной, як звычайна, а дзвюх паралельных форм і нават двух інфінітываў.

Даследаваны фактычны матэрыял беларускай мовы таксама паказвае недастатковасць крытэрыяў на карысць словазменнай і змешанай, часткова словазменнай і часткова класіфікуючай трактоўкі катэгорыі трывання.

1. Паміж членамі трывальных карэляцый як прэфіксальнага, так і суфіксальнага тыпу няма поўнай семантычнай тоеснасці. Па-першае, у трывальнай пары мнагазначныя дзеясловы супадаюць не ва ўсіх сваіх лексічных значэннях. Рахыходжанне ў семантыцы членаў трывальных карэляцый з'яўляецца вельмі пашыраным у беларускай мове. Напрыклад, дзеясловы *адрозніць – адрозніваць* фарміруюць трывальную пару. Аднак у семантычнай структуры дзеяслова *адрозніваць* маецца значэнне 'з'яўляцца адметнай асаблівасцю, адзнакай аднаго прадмета, адной з'явы ў параўнанні з іншымі прадметамі, з'явамі'. У такім значэнні дадзены дзеяслоў не

дэрываты, якія ўтвараюцца вельмі актыўна з дапамогай шматлікіх прыставак, складаюць больш паловы вытворных дзеясловаў закончанага трывання. Таксама дастаткова пашырана ў словаўтварэнні постфіксацыя. Суфіксальны, прэфіксальна-суфіксальны, прэфіксальна-постфіксальны спосабы выкарыстоўваюцца параўнальна рэдка пры ўтварэнні дзеясловаў закончанага трывання. Большасць словаўтваральных тыпаў вызначаецца малой прадуктыўнасцю. Астатнія спосабы (прэфіксальна-суфіксальна-постфіксальны і асновакладанне) практычна не характэрны для словаўтварэння дзеясловаў закончанага трывання.

Двухтрывальныя дзеясловы з'яўляюцца нешматлікімі і не маюць такой разгалінаванай сістэмы словаўтваральных спосабаў і сродкаў, якая ўласціва для дзеясловаў незакончанага і закончанага трывання. Гэта ў асноўным тлумачыцца тым, што двухтрывальнасць не з'яўляецца тыповай з'явай для беларускай мовы. Утварэнне двухтрывальных дзеясловаў адбываецца толькі суфіксальным, постфіксальным спосабамі і шляхам асновакладання. Суфіксацыя выступае вядучым словаўтваральным спосабам, у межах якога ўзнікае асноўная група дэрыватаў. Аднак суфіксальнае словаўтварэнне двухтрывальных дзеясловаў значна менш прадуктыўнае і развітае, чым суфіксальнае словаўтварэнне дзеясловаў незакончанага трывання. Постфіксацыя ў сістэме словаўтварэння двухтрывальных дзеясловаў з'яўляецца даволі пашыранай. Асновакладанне ў адрозненне ад названых спосабаў нехарактэрна для ўтварэння двухтрывальных дзеясловаў.

3. У беларускай мове катэгорыя трывання дзеяслова, якая ўяўляе сабой граматычную катэгорыю класіфікуючага тыпу, не мае словазменных афіксаў для выражэння трывання. У якасці сродку выражэння трывальнага значэння выступаюць словаўтваральныя па сваёй прыродзе афіксы. Гэта з'яўляецца адным з найважнейшых праяўленняў узаемасувязі катэгорыі трывання і дзеяслоўнага словаўтварэння.

У выніку праведзенага даследавання выяўлена, што пераважная большасць дзеяслоўных словаўтваральных афіксаў (33 з 40) валодае здольнасцю выражаць трыванне. Граматычная функцыя для асноўнай часткі афіксаў з'яўляецца дадатковай. Гэта азначае, што даныя сродкі перш за ўсё выконваюць словаўтваральную функцыю, служаць для ўтварэння дзеясловаў з новай семантыкай і разам з тым прыстасаваны ў мове для выражэння трывальнага значэння. Граматычная функцыя некаторых афіксаў аказваецца асабліва значнай і фактычна выступае нараўне са словаўтваральнай функцыяй. Гэтыя афіксы ў працэсе дэрывацыі не змяняюць лексічнае значэнне матывавальных слоў, яны толькі надаюць матываваным словам трывальнае значэнне. Такім чынам, спецыфічная, і нават унікальная, асаблівасць названых афіксаў як словаўтваральных сродкаў заключаецца ў тым, што яны выяўляюць важныя рысы падабенства са словазменнымі афіксамі. Прычым суфіксы **-а$_3$-** (-я-), **-ва-** (**-іва-**, **-ыва-**, **-оўва-**) у значнай ступені набліжаны да словазменных сродкаў. Зусім невялікую па колькасці групу складаюць дзеяслоўныя афіксы, якія не здольны выражаць трывальнае значэнне. Яны надаюць матывавальным словам толькі лексічнае значэнне і ніякім чынам не ўплываюць на іх трывальную характарыстыку. Матываваныя дзеясловы ў такім выпадку захоўваюць трывальнае значэнне матывавальных слоў, якое выражана ў корані або з дапамогай пэўных афіксальных сродкаў.

Пры словаўтварэнні змешанымі спосабамі афіксы выражаюць звычайна тыя ж самыя тыпы значэнняў, што і пры словаўтварэнні чыстымі спосабамі: лексічнае і трывальнае, толькі лексічнае ці толькі трывальнае. Аднак некаторыя афіксы, якія валодаюць двума тыпамі значэнняў, пры ўтварэнні слоў змешанымі спосабамі могуць страчваць здольнасць выражаць трыванне. Гэта тлумачыцца адсутнасцю ў словаўтваральных ланцужках пэўных звёнаў – дэрыватаў, у якіх афіксы выступалі б носьбітамі трывальнага значэння.

Асноўныя палажэнні і вынікі дысертацыі адлюстраваны ў наступных публікацыях:

**Артыкулы**

1. Кузьміна А.У. Катэгорыя трывання дзеяслова ў беларускай мове // Весці Нацыяльнай акадэміі навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук. – 2004. – № 2. – С. 113-118.
2. Кузьміна А.У. Катэгорыя трывання і тыпалогія дзеясловаў у беларускай мове // Веснік БДУ. Серыя 4. Філалогія. Журналістыка. Педагогіка. – 2004. – № 3. – С. 35-40
3. Кузьміна А.У. Суадноснасць лексічнага і граматычнага (трывальнага) значэнняў афіксаў // Весці ВДУ. – 2004. - № 4(34). – С. 60-64.

**Матэрыялы навуковых канферэнцый**

4. Кузьміна А.У. Асаблівасці ўтварэння адыменных дзеясловаў закончанага трывання ў беларускай мове // Матэрыялы VIII Міжнароднай канферэнцыі "Словаўтварэнне і намінатыўная дэрывацыя" (Гродна, 15-16 красавіка 2003). – Гродна: ГрГУ, 2003. – С. 204-208.
5. Кузьміна А.У. Словаўтваральныя асаблівасці катэгорыі трывання ў беларускай мове // Матэрыялы III Міжнароднай навуковай канферэнцыі "Мова – літаратура – культура", прысвечанай 120-годдзю з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа (Мінск, 27-28 верасня 2002) / Рэд. кал.: З.І. Бадзевіч і інш.: У 2 т. – Т. 1. – Мн.: БДУ, 2002. – С. 198-203.

**Тэзісы дакладаў навуковай канферэнцыі**

6. Кузьміна А.У. Спосабы і сродкі ўтварэння дзеясловаў незакончанага трывання ў беларускай мове // Тэзісы VI канферэнцыі Камісіі па славянскаму словаўтварэнню пры Міжнародным камітэце славістаў "Праблемы тэорыі і гісторыі славянскага словаўтварэння" (Мінск, 3-5 сакавіка 2003 г.). – Мінск, 2003. – С. 71-74.

# РЭЗЮМЕ

**Андрэева Алеся Уладзіміраўна**

## Катэгорыя трывання дзеяслова ў беларускай мове (граматыка-словаўтваральны аспект)

**Ключавыя словы**: словазменная катэгорыя, класіфікуючая катэгорыя, трывальная пара, парныя дзеясловы, няпарныя дзеясловы, аднатрывальныя дзеясловы, двухтрывальныя дзеясловы, дзеясловы незакончанага трывання, дзеясловы закончанага трывання, словаўтваральны спосаб, словаўтваральны фармант, словаўтваральны тып, прадуктыўнасць тыпу, дзеяслоўны афікс, лексічнае значэнне, трывальнае значэнне.

**Аб'ект і прадмет даследавання**. Аб'ектам даследавання з'яўляюцца вытворныя дзеясловы незакончанага трывання, дзеясловы закончанага трывання і двухтрывальныя дзеясловы. У якасці прадмета даследавання выступаюць аспекты ўзаемасувязі катэгорыі трывання і дэрывацыйных працэсаў – асаблівасці ўтварэння дзеясловаў той ці іншай трывальнай характарыстыкі і ўдзел дзеяслоўных словаўтваральных афіксаў у выражэнні трывальнага значэння.

**Мэта дысертацыі**: граматыка-словаўтваральная характарыстыка катэгорыі трывання дзеяслова ў беларускай мове.

**Метады даследавання.** Асноўным метадам дысертацыйнага даследавання з'яўляецца апісальны метад. У рабоце выкарыстоўваюцца прыёмы словаўтваральнага аналізу і элементы колькаснага падліку.

**Навуковая навізна.** Навуковая навізна дысертацыі заключаецца ў тым, што ўпершыню ў беларускім мовазнаўстве прадметам самастойнага даследавання сталі аспекты ўзаемасувязі катэгорыі трывання і дэрывацыйных працэсаў (словаўтварэнне дзеясловаў таго ці іншага трывання, удзел дзеяслоўных словаўтваральных афіксаў у выражэнні трывальнага значэння). Абгрунтоўваецца класіфікуючы характар катэгорыі трывання дзеяслова ў беларускай мове. На аснове багатага фактычнага матэрыялу з неабходнай паўнатой апісваецца словаўтварэнне дзеясловаў пэўнай трывальнай характарыстыкі: дзеясловаў незакончанага трывання, дзеясловаў закончанага трывання і двухтрывальных дзеясловаў, удакладняюцца словаўтваральныя тыпы дзеясловаў, якія традыцыйна вылучаюцца ў беларускай дэрываталогіі, а таксама іх характарыстыка паводле прадуктыўнасці. Дзеяслоўныя словаўтваральныя афіксы разглядаюцца з пункту гледжання іх здольнасці выражаць лексічнае і трывальнае значэнні.

**Практычная значнасць даследавання.** Вынікі дысертацыйнага даследавання маюць значэнне для далейшай распрацоўкі пытанняў аспекталогіі і дзеяслоўнага словаўтварэння. Яны могуць прымяняцца ў выкладанні беларускай мовы пры вывучэнні раздзелаў "Марфалогія" і "Словаўтварэнне" ў вышэйшых навучальных установах на філалагічных факультэтах. Матэрыялы даследавання будуць карысныя пры падрыхтоўцы вучэбных дапаможнікаў і лексікаграфічных даведнікаў.

# РЕЗЮМЕ

**Андреева Алеся Владимировна**

**Категория вида глагола в белорусском языке (грамматико-словообразовательный аспект)**

**Ключевые слова**: словоизменительная категория, классифицирующая категория, видовая пара, парные глаголы, непарные глаголы, одновидовые глаголы, двувидовые глаголы, глаголы несовершенного вида, глаголы совершенного вида, словообразовательный способ, словообразовательный формант, словообразовательный тип, продуктивность типа, глагольный аффикс, лексическое значение, видовое значение.

**Объект и предмет исследования**. Объектом исследования являются производные глаголы несовершенного вида, глаголы совершенного вида и двувидовые глаголы. В качестве предмета исследования выступают аспекты взаимосвязи категории вида и деривационных процессов – особенности образования глаголов той или иной видовой характеристики и участие глагольных словообразовательных аффиксов в выражении видового значения.

**Цель диссертации**: грамматико-словообразовательная характеристика категории вида глагола в белорусском языке.

**Методы исследования.** Основным методом диссертационного исследования является описательный метод. В работе используются приёмы словообразовательного анализа и элементы количественного подсчёта.

**Научная новизна.** Научная новизна диссертации заключается в том, что впервые в белорусском языкознании предметом самостоятельного исследования стали аспекты взаимосвязи категории вида и деривационных процессов (словообразование глаголов того или иного вида, участие глагольных словообразовательных аффиксов в выражении видового значения). Обосновывается классифицирующий характер категории вида глагола в белорусском языке. На основе богатого фактического материала с необходимой полнотой описывается словообразование глаголов определённой видовой характеристики: глаголов несовершенного вида, глаголов совершенного вида и двувидовых глаголов, уточняются словообразовательные типы глаголов, традиционно выделяемые в белорусской дериватологии, а также их характеристика по продуктивности. Глагольные словообразовательные аффиксы рассматриваются с точки зрения их способности выражать лексическое и видовое значения.

**Практическая значимость исследования.** Результаты диссертационного исследования имеют значение для дальнейшей разработки вопросов аспектологии и глагольного словообразования. Они могут применяться в преподавании белорусского языка при изучении разделов "Морфология" и "Словообразование" в высших учебных заведениях на филологических факультетах. Материалы исследования будут полезны при подготовке учебных пособий и лексикографических справочников.

## SUMMARY


**Andreyeva Alesia**

**Verbal aspect in Belarusian (grammatical-derivational aspect)**

**Key words**: inflexional category, classifying category, aspectual pair, pair verbs, non-pair verbs, one-aspect verbs, two-aspect verbs, imperfective verbs, perfective verbs, derivational means, derivational formant, derivational type, productivity of type, verbal affix, lexical meaning, aspectual meaning.

**The object and the subject of the research**. The object of the research is derivative imperfective, perfective and two-aspect verbs. The subject of the research is interrelation of aspect and verbal derivation – processes of formation of imperfective, perfective and two-aspect verbs and participation of derivational affixes in aspectual meaning expression.

**The aim of the research**: the grammatical- derivational characteristics of verbal aspect in Belarusian.

**The methods of research.** The basic method of dissertational research is the descriptive method. In work derivational analysis and elements of quantitative calculation are used.

**The scientific novelty and the importance of the received results.** The scientific novelty of the dissertation consists in the fact that for the first time interrelations of aspect and derivational processes – word-formation of imperfective, perfective and two-aspect verbs participation of verbal derivational affixes in aspectual meaning expression – became in the Belarusian linguistics the subject of independent research,. Classifying character of verbal aspect in Belarusian is proved. On the basis of the rich factual material with necessary completeness word-formation of imperfective, perfective and two-aspect verbs is described. The derivational verb types traditionally evolved in Belarusian word-formation and their productivity characteristics are specified. Verbal derivational affixes are considered from the point of view of their ability to express lexical and aspectual meanings.

**The practical value of the research.** The results of the dissertational research are of importance for the further development of the questions of aspect and verbal word-formation. They can be applied in teaching the Belarusian language at high schools for courses "Morphology" and "Word-formation" at philological faculties. The materials of the research will be useful in creation of manuals and lexicographic reference books.



Подписано в печать 19.05.2005. Формат 69x84 1/16 Бумага офсетная Гарнитура Roman
Печать цифровая Усл.печ.л. 1,2 Уч.изд.л. 1,3. Тираж 100 экз. Заказ № 5.
ИООО «Право и экономика» Лицензия № 02330/0056831 от 01.04.2004.
220072 Минск Сурганова 1, корп. 2. Тел. 284 18 66, 8 029 684 18 66.
Отпечатано на настольно-издательской системе XEROX.